ОСВО 1-21 80 13-2012

**АДУКАЦЫЙНЫ СТАНДАРТ**
**ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ**

---

# ВЫШЭЙШАЯ АДУКАЦЫЯ
# ДРУГАЯ СТУПЕНЬ (МАГІСТРАТУРА)

**Спецыяльнасць** 1-21 80 13 Культуралогія
**Ступень** Магістр культуралогіі

# ВЫСШЕЕ ОБРАЗОВАНИЕ
# ВТОРАЯ СТУПЕНЬ (МАГИСТРАТУРА)

**Специальность** 1-21 80 13 Культурология
**Степень** Магистр культурологии

# HIGHER EDUCATION
# SECOND STAGE (MASTER'S STUDIES)

**Speciality** 1-21 80 13 Cultural Studies
**Degree** Master of Arts in Cultural Studies

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Мінск

УДК 006:89:[378.22(476):008]

**Ключавыя словы:** адукацыйная праграма, вышэйшая адукацыя, другая ступень (магістратура), кампетэнтнасць, культуралогія, магістр, магістарская дысертацыя, якасць вышэйшай адукацыі.

МКС 03.180

## Прадмова

1. РАСПРАЦАВАНЫ ўстановай адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”

ВЫКАНАЎЦЫ:
***Смолік А.І.***, доктар культуралогіі, прафесар (кіраўнік);
***Бондар Ю.П.***, кандыдат палітычных навук, дацэнт;
***Ровіна Р.А.***, кандыдат педагагічных навук, дацэнт;
***Каралёў М.М.***, кандыдат педагагічных навук, дацэнт;
***Чарняўская Ю.В.***, кандыдат культуралогіі, дацэнт;
***Варановіч І.М.***, кандыдат культуралогіі;
***Шпарло С.Л.***, намеснік начальніка вучэбна-метадычнага аддзела

УНЕСЕНЫ Галоўным упраўленнем вышэйшай адукацыі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

2. ЗАЦВЕРДЖАНЫ І ЎВЕДЗЕНЫ Ў ДЗЕЯННЕ пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад “24” 08 2012 г. № 105

3. УВЕДЗЕНЫ ЎПЕРШЫНЮ

ГОСУДАРСТВЕННОЕ УЧРЕЖДЕНИЕ ОБРАЗОВАНИЯ "РЕСПУБЛИКАНСКИЙ ИНСТИТУТ ВЫСШЕЙ ШКОЛЫ"

Сапраўдны стандарт не можа быць тыражаваны і распаўсюджаны без дазволу Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Выдадзены на беларускай мове

## ЗМЕСТ

**1. Галіна выкарыстання** ........ 4
**2. Нарматыўныя спасылкі** ........ 4
**3. Асноўныя тэрміны і азначэнні** ........ 5
**4. Агульныя палажэнні** ........ 5
4.1. Агульная характарыстыка спецыяльнасці ........
4.2. Патрабаванні да ўзроўню асноўнай адукацыі асоб, якія паступаюць для атрымання вышэйшай адукацыі другой ступені ........ 5
4.3. Формы атрымання вышэйшай адукацыі другой ступені ........ 6
4.4. Тэрміны атрымання вышэйшай адукацыі другой ступені ........ 6
**5. Характарыстыка прафесійнай дзейнасці магістра** ........ 6
5.1. Сфера прафесійнай дзейнасці магістра ........ 6
5.2. Аб'екты прафесійнай дзейнасці магістра ........ 6
5.3. Віды прафесійнай дзейнасці магістра ........ 6
5.4. Задачы прафесійнай дзейнасці магістра ........ 7
5.5. Магчымасці працягу адукацыі магістра ........ 7
**6. Патрабаванні да кампетэнтнасці магістра** ........ 7
6.1. Склад кампетэнцый магістра ........ 7
6.2. Патрабаванні да акадэмічных кампетэнцый магістра ........ 8
6.3. Патрабаванні да сацыяльна-асобасных кампетэнцый магістра ........ 8
6.4. Патрабаванні да прафесійных кампетэнцый магістра ........ 9
**7. Патрабаванні да адукацыйнай праграмы і зместу вучэбна-праграмнай дакументацыі** ........ 10
7.1. Склад вучэбна-праграмнай дакументацыі ........ 10
7.2. Агульныя патрабаванні да распрацоўкі вучэбна-праграмнай дакументацыі ........ 10
7.3. Патрабаванні да складання графіка адукацыйнага працэсу ........ 10
7.4. Патрабаванні да структуры тыпавога вучэбнага плана па спецыяльнасці ........ 11
7.5. Патрабаванні да распрацоўкі індывідуальнага плана работы магістранта ........ 13
7.6. Патрабаванні да абавязковага мінімуму зместу вучэбных праграм і кампетэнцый па вучэбных дысцыплінах ........ 13
7.7. Патрабаванні да зместу навукова-даследчай работы магістранта ........ 15
7.8. Патрабаванні да зместу і арганізацыі практыкі ........ 15
**8. Патрабаванні да арганізацыі адукацыйнага працэсу** ........ 15
8.1. Патрабаванні да кадравага забеспячэння адукацыйнага працэсу ........ 15
8.2. Патрабаванні да матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння адукацыйнага працэсу ........ 16
8.3. Патрабаванні да навукова-метадычнага забеспячэння адукацыйнага працэсу ........ 16
8.4. Патрабаванні да арганізацыі самастойнай работы ........ 16
8.5. Патрабаванні да арганізацыі ідэалагічнай і выхаваўчай работы ........ 16
8.6. Агульныя патрабаванні да кантролю якасці адукацыі і сродкаў дыягностыкі кампетэнцый ........ 16
**9. Патрабаванні да выніковай атэстацыі** ........ 17
9.1. Агульныя патрабаванні ........ 17
9.2. Патрабаванні да магістарскай дысертацыі ........ 17
**Дадатак Бібліяграфія** ........ 18

**АДУКАЦЫЙНЫ СТАНДАРТ**
**ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ**

---

**ВЫШЭЙШАЯ АДУКАЦЫЯ. ДРУГАЯ СТУПЕНЬ (МАГІСТРАТУРА)**
**Спецыяльнасць** 1-21 80 13 Культуралогія
**Ступень** Магістр культуралогіі

**ВЫСШЕЕ ОБРАЗОВАНИЕ. ВТОРАЯ СТУПЕНЬ (МАГИСТРАТУРА)**
**Специальность** 1-21 80 13 Культурология
**Степень** Магистр культурологии

**HIGHER EDUCATION. SECOND STAGE (MASTER'S STUDIES)**
**Speciality** 1-21 80 13 Cultural Studies
**Degree** Master of Arts in Cultural Studies

---

Дата ўвядзення **2012-09-01**

## 1. Галіна выкарыстання

Стандарт выкарыстоўваецца пры распрацоўцы вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі другой ступені, якая фарміруе веды, уменні і навыкі навукова-педагагічнай і навукова-даследчай работы і забяспечвае атрыманне ступені магістра (далей – адукацыйная праграма магістратуры), вучэбна-метадычнай дакументацыі, вучэбных выданняў, інфармацыйна-аналітычных матэрыялаў, сістэм кіравання якасцю вышэйшай адукацыі.

Стандарт абавязковы для выкарыстання ва ўсіх установах вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы магістратуры.

## 2. Нарматыўныя спасылкі

У дадзеным стандарце выкарыстаны спасылкі на наступныя прававыя акты:

ГОСТ 31279-2004 Инновационная деятельность. Термины и определения

СТБ ИСО 9000-2006 Система менеджмента качества. Основные положения и словарь

Общегосударственный классификатор Республики Беларусь ОКРБ 005-2011 "Виды экономической деятельности"

Общегосударственный классификатор Республики Беларусь ОКРБ 011-2009 "Специальности и квалификации"

Кодекс Республики Беларусь об образовании (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2011 г., №13, 2/1795)

Адукацыйны стандарт Рэспублікі Беларусь ОСРБ 1-21 04 01-2008 "Вышэйшая адукацыя. Першая ступень. Спецыяльнасць 1-21 04 01 Культуралогія (па напрамках)".

## 3. Асноўныя тэрміны і азначэнні

У дадзеным адукацыйным стандарце ўжываюцца тэрміны, якія ўстаноўлены ў Кодэксе Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, а таксама наступныя тэрміны з адпаведнымі азначэннямі:

**Інавацыі** – новыя або ўдасканаленыя тэхналогіі, віды прадукцыі або паслуг, а таксама арганізацыйна-тэхнічныя рашэнні вытворчага, адміністрацыйнага, камерцыйнага або іншага характару, якія спрыяюць прасоўванню тэхналогій, таварнай прадукцыі і паслуг на рынак (ГОСТ *31279-2004*).

**Інавацыйная дзейнасць** – дзейнасць, якая забяспечвае стварэнне і рэалізацыю інавацый (ГОСТ 31279-2004).

**Кампетэнтнасць** – выражаная здольнасць прымяняць веды і ўменні (СТБ ИСО 9000-2006).

**Кампетэнцыя** – веды, уменні і вопыт, неабходныя для вырашэння тэарэтычных і практычных задач.

**Культуралогія** – навука аб культуры, якая займаецца сістэмным даследаваннем культуры і мэтанакіравана на разуменне ўсеагульных заканамернасцей функцыянавання культуратворчасці, генезісу з'яў сусветнай і айчыннай культуры.

**Магістр** – асоба, якая засвоіла змест адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі другой ступені, якая фарміруе веды, уменні і навыкі навукова-педагагічнай і навукова-даследчай работы і забяспечвае атрыманне ступені магістра або адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі другой ступені з паглыбленай падрыхтоўкай спецыяліста, якая забяспечвае атрыманне ступені магістра.

**Магістарская дысертацыя** – самастойна выкананая навукова-даследчая работа, якая мае ўнутранае адзінства, прысвечаная вырашэнню тэарэтычнай, эксперыментальнай або прыкладной задачы адпаведнай сферы прафесійнай дзейнасці, якая сведчыць аб асабістым укладзе аўтара ў навуку і (або) практыку.

## 4. Агульныя палажэнні

### 4.1. Агульная характарыстыка спецыяльнасці

Спецыяльнасць 1-21 80 13 **"Культуралогія"** ў адпаведнасці з ОКРБ 011-2009 адносіцца да профілю адукацыі **"Гуманітарныя навукі"**, напрамку адукацыі ***21 "Гуманітарныя навукі"*** *і забяспечвае атрыманне ступені* магістра культуралогіі.

### 4.2. Патрабаванні да ўзроўню асноўнай адукацыі асоб, якія паступаюць для атрымання вышэйшай адукацыі другой ступені

4.2.1. Узровень асноўнай адукацыі асоб, якія паступаюць для атрымання вышэйшай адукацыі другой ступені – вышэйшая адукацыя першай ступені

– па спецыяльнасцях:

1-17 01 05 Рэжысура свят (па напрамках).

1-21 04 01 Культуралогія (па напрамках).

1-21 04 02 Мастацтвазнаўства (па напрамках).

– па напрамку спецыяльнасці:

1-18 01 01-05 Народная творчасць (фальклор).

4.2.2. Асобы, якія маюць вышэйшую адукацыю першай ступені па іншых спецыяльнасцях, удзельнічаюць у конкурсе з улікам вынікаў здачы дадатковых экзаменаў па вучэбных дысцыплінах, пералік якіх вызначаецца ўстановай вышэйшай адукацыі ў адпаведнасці з рэкамендацыямі вучэбна-метадычнага аб'яднання па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў.

**4.3. Формы атрымання вышэйшай адукацыі другой ступені**

Навучанне ў магістратуры прадугледжвае наступныя формы: вочная (дзённая, вячэрняя) і завочная.

**4.4. Тэрміны атрымання вышэйшай адукацыі другой ступені**

Нарматыўны тэрмін атрымання вышэйшай адукацыі другой ступені ў дзённай форме складае 1 год.

Тэрміны атрымання вышэйшай адукацыі другой ступені ў вячэрняй і завочнай формах могуць павялічвацца на 0,5 года адносна нарматыўнага тэрміну.

## 5. Характарыстыка прафесійнай дзейнасці магістра

**5.1. Сфера прафесійнай дзейнасці магістра**

Асноўнымі сферамі прафесійнай дзейнасці магістраў з'яўляюцца:

– 72 Навуковыя даследаванні і распрацоўкі;

– 85 Адукацыя;

– 90 Творчая дзейнасць і забавы;

– 91 Дзейнасць бібліятэк, архіваў, музеяў і іншая дзейнасць у галіне культуры.

**5.2. Аб'екты прафесійнай дзейнасці магістра**

Аб'ектамі прафесійнай дзейнасці магістра з'яўляюцца:

– феномены і з'явы духоўнай і матэрыяльнай культуры;

– спосабы, формы і механізмы засваення, захавання, стварэння і трансляцыі здабыткаў сусветнай і айчыннай культуры;

– працэсы ўзаемадзеяння асобы і культуры, культуры і грамадства, культуры і прыроды;

– адукацыйныя інавацыі.

**5.3. Віды прафесійнай дзейнасці магістра**

Магістр павінен быць кампетэнтным у наступных відах дзейнасці:

– навукова-даследчай;

– вучэбна-педагагічнай;

– арганізацыйна-кіраўніцкай;

– інавацыйна-метадычнай.

**5.4. Задачы прафесійнай дзейнасці магістра**

Магістр павінен быць падрыхтаваны да вырашэння наступных задач прафесійнай дзейнасці:

– выкладанне культуралагічных дысцыплін для ўсіх узроставых катэгорый насельніцтва;

– навукова-даследчая дзейнасць па праблемах тэорыі і гісторыі сусветнай і айчыннай культуры;

– арганізацыя сацыялізацыі, інкультурацыі і акультурацыі асобы;

– фарміраванне ў суб'ектаў грамадства эстэтычнай, палітычнай, прававой, маральнай, экалагічнай, фізічнай культуры;

– укараненне ў сваю прафесійную дзейнасць сучасных адукацыйных тэхналогій, камп'ютарных метадаў і форм апрацоўкі навуковай інфармацыі;

– распрацоўка плана-праспекта і праграмы навуковых даследаванняў, *падрыхтоўка заданняў для выканаўцаў;*

– збор, апрацоўка, аналіз і сістэматызацыя навуковай інфармацыі, выбар методык і сродкаў вырашэння задач;

– вывучэнне, укараненне вынікаў навукова-даследчай дзейнасці;

– выпрацоўка практычных рэкамендацый па ўкараненні вынікаў даследаванняў;

– напісанне вучэбна-метадычных дапаможнікаў і манаграфій па культуралогіі.

**5.5. Магчымасці працягу адукацыі магістра**

Магістр павінен быць падрыхтаваны да засваення адукацыйнай праграмы аспірантуры (ад'юнктуры) пераважна па наступных спецыяльнасцях:

09.00.13 Філасофская антрапалогія, філасофія культуры;

13.00.05 Тэорыя, методыка і арганізацыя сацыяльна-культурнай дзейнасці;

17.00.09 Тэорыя і гісторыя мастацтва;

22.00.06 Сацыялогія культуры;

24.00.01 Тэорыя і гісторыя культуры.

## 6. Патрабаванні да кампетэнтнасці магістра

**6.1. Склад кампетэнцый магістра**

Засваенне адукацыйнай праграмы магістратуры павінна забяспечыць фарміраванне наступных груп кампетэнцый:

**акадэмічных кампетэнцый** – паглыбленых навукова-тэарэтычных, метадалагічных ведаў і даследчых уменняў, якія забяспечваюць распрацоўку навукова-даследчых праектаў або вырашэнне задач навуковага даследавання, інавацыйнай дзейнасці, бесперапыннай самаадукацыі;

***сацыяльна-асобасных кампетэнцый*** – асобасных якасцей і ўменняў кіраваца сацыяльна-культурнымі і маральнымі каштоўнасцямі; здольнасцей да сацыяльнага, міжкультурнага ўзаемадзеяння, крытычнага мыслення;

сацыяльнай адказнасці, якія дазваляюць вырашаць сацыяльна-прафесійныя, арганізацыйна-кіраўніцкія, выхаваўчыя задачы;

**прафесійных кампетэнцый** – паглыбленых ведаў па спецыяльных дысцыплінах і здольнасцей вырашаць складаныя прафесійныя задачы, задачы навукова-даследчай і навукова-педагагічнай дзейнасці, распрацоўваць і ўкараняць інавацыйныя праекты, ажыццяўляць бесперапыннае прафесійнае самаўдасканаленне.

### 6.2. Патрабаванні да акадэмічных кампетэнцый магістра

Магістр павінен мець:

АК-1. Здольнасць да самастойнай навукова-даследчай дзейнасці (аналіз, супастаўленне, сістэматызацыя, абстрагаванне, мадэліраванне, праверка дакладнасці даных, прыняцце рашэнняў і г.д.), гатоўнасць генерыраваць і выкарыстоўваць новыя ідэі.

АК-2. Метадалагічныя веды і даследчыя ўменні, якія забяспечваюць вырашэнне задач навукова-даследчай, вучэбна-педагагічнай, арганізацыйна-кіраўніцкай і інавацыйна-метадычнай дзейнасці.

АК-3. Патрэбнасць на працягу жыцця самастойна навучацца, забяспечваць асобаснае і прафесійнае самаразвіццё.

АК-4. Падрыхтаванасць да стварэння культурнага, сацыяльнага і педагагічнага праектавання сацыякультурнай дзейнасці.

АК-5. Навыкі і ўменні пабудовы найбольш эфектыўных мадэлей вучэбна-выхаваўчага працэсу з мэтай самаактуалізацыі і самарэалізацыі суб'ектаў культуры.

АК-6. Арганізатарскія здольнасці да педагагічнай дзейнасці на аснове актыўнасці, добраахвотнасці, крэатыўнасці, спалучэння эмацыянальнага і рацыянальнага кампанентаў свядомасці.

### 6.3. Патрабаванні да сацыяльна-асобасных кампетэнцый

Магістр павінен:

САК-1. Улічваць і выкарыстоўваць сацыяльныя і маральна-этычныя нормы ў асобаснай і сацыяльна-прафесійнай жыццядзейнасці.

САК-2. Ведаць і выконваць правы і абавязкі грамадзяніна.

САК-3. Быць здольным да супрацоўніцтва і работы ў камандзе.

САК-4. Валодаць камунікатыўнымі здольнасцямі для работы ў міждысцыплінарным і міжнародным асяроддзі.

САК-5. Пазітыўна адносіцца да традыцый і навацый у нацыянальнай і іншых культурах.

САК-6. Развіваць унутрыасобасны змест духоўна-маральных каштоўнасцей, норм, ідэалаў, патэрнаў нацыянальнай культуры.

САК-7. Быць здольным да ўзаемадзеяння, супрацоўніцтва, разумнага кампрамісу падчас вырашэння інавацыйных праблем.

САК-8. Успрымаць і пераасэнсоўваць каштоўнасці, нормы, артэфакты культуры іншых супольнасцей.

**6.4. Патрабаванні да прафесійных кампетэнцый магістра**

Магістр павінен быць здольным:

**Навукова-даследчая дзейнасць**

ПК-1. Ажыццяўляць навукова-даследчую дзейнасць у галіне фундаментальнай і прыкладной культуралогіі, філасофіі культуры, сацыялогіі культуры, культурнай антрапалогіі, лінгвакультуралогіі.

ПК-2. Складаць планы і праграмы даследаванняў па асноўных праблемах сацыядынамікі культуры.

ПК-3. Збіраць, аналізаваць і сістэматызаваць тэарэтычны і эксперыментальны матэрыял.

ПК-4. Распрацоўваць методыку сацыялагічных даследаванняў, апрацоўваць матэрыялы і на іх аснове рабіць навукова абгрунтаваныя высновы.

ПК-5. Рыхтаваць навуковыя артыкулы ў рэцэнзуемыя часопісы, даклады на навуковыя канферэнцыі.

**Вучэбна-педагагічная дзейнасць**

ПК-6. Выкладаць культуралагічныя дысцыпліны на сучасным навукова-тэарэтычным і метадычным узроўнях.

ПК-7. Валодаць глыбокімі навукова-тэарэтычнымі і метадалагічнымі ведамі ў галіне фундаментальнай і прыкладной культуралогіі, філасофіі культуры, сацыялогіі культуры, педагогікі і псіхалогіі.

ПК-8. Распрацоўваць вучэбныя праграмы і планы па культуралагічных дысцыплінах.

ПК-9. Ведаць сучасныя адукацыйныя тэхналогіі і выкарыстоўваць іх у вучэбна-выхаваўчым працэсе.

ПК-10. Арганізоўваць самастойную вучэбна-пазнавальную дзейнасць навучэнцаў з улікам іх індывідуальных асобасных якасцей.

ПК-11. Спрыяць духоўнаму выхаванню навучэнцаў, фарміраванню ў іх гуманістычнага светапогляду, самастойнага мыслення, пачуцця нацыянальнай і асабістай годнасці, адданасці агульначалавечым каштоўнасцям і ідэалам.

**Арганізацыйна-кіраўніцкая дзейнасць**

ПК-12. Арганізоўваць культуратворчую дзейнасць з суб'ектамі культуры.

ПК-13. Выкарыстоўваць нарматыўна-прававую базу ў галіне культуры.

ПК-14. Фарміраваць структуру аб'екта культуры, забяспечваць яе ўсім неабходным для эфектыўнага функцыянавання.

ПК-15. Рацыянальна выкарыстоўваць сучасныя прынцыпы, метады, формы, сродкі і механізмы кіравання сферай культуры.

**Інавацыйна-метадычная дзейнасць**

ПК-16. Ацэньваць стан, тэндэнцыі і перспектывы развіцця мастацтва і культуры.

ПК-17. Прагназаваць, планаваць і ажыццяўляць інавацыйна-метадычную і мастацка-творчую дзейнасць устаноў культуры і мастацтва.

## 7. Патрабаванні да адукацыйнай праграмы і зместу вучэбна-праграмнай дакументацыі

### 7.1. Склад вучэбна-праграмнай дакументацыі

7.1.1. Адукацыйная праграма вышэйшай адукацыі другой ступені, якая фарміруе веды, уменні і навыкі навукова-педагагічнай і навукова-даследчай работы і забяспечвае атрыманне ступені магістра, уключае наступную вучэбна-праграмную дакументацыю:

– тыпавы вучэбны план па спецыяльнасці;

– вучэбны план установы вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці;

– тыпавыя вучэбныя праграмы па вучэбных дысцыплінах;

– праграмы-мінімумы кандыдацкіх экзаменаў па агульнаадукацыйных дысцыплінах;

– праграмы-мінімумы кандыдацкіх залікаў (дыферэнцыраваных залікаў) па агульнаадукацыйных дысцыплінах;

– вучэбныя праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбных дысцыплінах;

– праграму практыкі;

– індывідуальны план работы магістранта.

### 7.2. Агульныя патрабаванні да распрацоўкі вучэбна-праграмнай дакументацыі

7.2.1. Максімальны аб'ём вучэбнай нагрузкі магістранта не павінен перавышаць 54 акадэмічныя гадзіны ў тыдзень, уключаючы ўсе віды аўдыторнай і пазааўдыторнай работы.

7.2.2. Аб'ём абавязковых аўдыторных заняткаў, які вызначаецца ўстановай вышэйшай адукацыі з улікам спецыяльнасці ўстанаўліваецца не больш 18 аўдыторных гадзін у тыдзень. Для магістрантаў з ліку замежных грамадзян аб'ём аўдыторных заняткаў можа быць павялічаны ўстановай вышэйшай адукацыі.

7.2.3. У гадзіны, якія адводзяцца на самастойную работу па вучэбнай дысцыпліне, уключаецца час на падрыхтоўку да экзаменаў.

7.2.4. Па завочнай форме атрымання адукацыі аб'ём аўдыторных заняткаў павінен быць не менш 60 акадэмічных гадзін у вучэбным годзе (уключаючы кансультацыі і іншыя віды аўдыторнай работы).

### 7.3. Патрабаванні да складання графіка адукацыйнага працэсу

7.3.1. Прыкладная колькасць тыдняў па відах дзейнасці у дзённай форме атрымання вышэйшай адукацыі вызначаецца ў адпаведнасці з табліцай 1.

*Табліца 1*

| Віды дзейнасці, установленыя вучэбным планам | Працягласць тэрміну навучання, тыдняў |
|---|---|
| | 1 год |
| Тэарэтычнае навучанне і навукова-даследчая работа | 32 |
| Экзаменацыйныя сесіі | 3 |
| Практыка | 2 |
| Выніковая атэстацыя | 5 |
| Канікулы | 2 |
| Усяго, тыдняў | 44 |

**7.4. Патрабаванні да структуры тыпавога вучэбнага плана па спецыяльнасці**

7.4.1. Тыпавы вучэбны план падрыхтоўкі магістра па адукацыйнай праграме вышэйшай адукацыі другой ступені, якая фарміруе веды, уменні і навыкі навукова-педагагічнай і навукова-даследчай работы і забяспечвае атрыманне ступені магістра, распрацоўваецца ў адпаведнасці са структурай, якая прыведзена ў табліцы 2.

*Табліца 2*

| № п/п | Назвы відаў дзейнасці магістранта, цыклаў дысцыплін, дысцыплін | Аб'ём работы (гадзін)[1] | | | Залі-ковыя адзін-кі[4] | Коды фарміруемых кампетэнцый[5] |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | усяго | з іх | | | |
| | | | аўд. заняткі | сам. работа | | |
| **1.** | **Цыкл дысцыплін кандыдацкіх экзаменаў і заліку** | **768** | **316** | **452** | | |
| 1.1 | Філасофія і метадалогія навукі[2] | 240 | 104 | 136 | 6 | АК-2,4; САК-6,8; ПК-1,2,4,7 |
| 1.2 | Замежная мова[2] | 420 | 140 | 280 | 11 | АК-1,3; САК-4,5,8; ПК-5,8 |
| 1.3 | Асновы інфармацыйных тэхналогій[2] | 108 | 72 | 36 | 3 | АК-1; САК-4; ПК-1-3,8-10,16,17 |
| **2.** | **Цыкл дысцыплін спецыяльнай падрыхтоўкі** | **386** | **202** | **184** | | |
| | *Дзяржаўны кампанент*[3] | *236* | *132* | *104* | | |
| 2.1 | Педагогіка і псіхалогія вышэйшай школы | 84 | 56 | 28 | 2 | АК-3,6; САК-1,2,4,7; ПК-6,10,11,16 |
| 2.2 | Фундаментальныя праблемы тэорыі і гісторыі культуры | 152 | 76 | 76 | 4 | АК-4,5; САК-3,8; ПК-2-5,15-17 |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | *Кампанент установы вышэйшай адукацыі* | *150* | *70* | *80* | *3,5* | АК-3; САК-1; ПК-12-14 |
| **3.** | **Падрыхтоўка да экзаменаў па спецыяльных дысцылінах** | **36** | | **36** | **1** | АК-1-3 |
| **4.** | **Навукова-даследчая работа** | **700** | | **700** | **19** | АК-1-3; ПК-1-5 |
| **5.** | **Практыка** | **108** | | **108** | **3** | АК-1-3; САК-1,3; ПК-6-11 |
| **6.** | **Выніковая атэстацыя** | **270** | | **270** | **7,5** | ПК-3,5,7,9,11,17 |
| | **Усяго** | **2268** | **518** | **1750** | **60** | |

*Заўвагі:*

*1. Установы вышэйшай адукацыі маюць права пераводзіць да 90% прадугледжаных тыпавым вучэбным планам па спецыяльнасці аўдыторных заняткаў у кіруемую самастойную работу магістранта (акрамя дысцыплін кандыдацкіх экзаменаў і заліку).*

*2. Колькасць гадзін па вучэбных дысцыплінах: "Філасофія і метадалогія навукі", "Замежная мова", "Асновы інфармацыйных тэхналогій" павінна быць не менш колькасці гадзін, якія прадугледжаны праграмамі-мінімумамі кандыдацкіх экзаменаў і заліку, зацверджанымі Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.*

*3. Набор дысцыплін дзяржаўнага кампанента вызначаецца вучэбна-метадычным аб'яднаннем у сферы вышэйшай адукацыі ў аб'ёме 30–35% ад цыкла дысцыплін спецыяльнай падрыхтоўкі. Кампанент установы вышэйшай адукацыі складае, адпаведна, 65–70%.*

*4. Сума заліковых адзінак пры атрыманні вышэйшай адукацыі ў дзённай форме павінна раўняцца 60 за 1 год навучання.*

*5. Коды фарміруемых кампетэнцый указваюцца ў адпаведнасці з пунктамі 6.2, 6.3, 6.4 сапраўднага стандарту.*

7.4.2. На падставе тыпавога вучэбнага плана па спецыяльнасці распрацоўваецца вучэбны план установы вышэйшай адукацыі, у якім установа вышэйшай адукацыі мае права змяняць аб'ём работы магістранта па розных відах дзейнасці, аб'ёмы цыклаў дысцыплін, колькасць гадзін, якія адводзяцца на засваенне вучэбных дысцыплін (у межах 10%), без перавышэння максімальнага тыднёвага аб'ёму нагрузкі магістранта і пры захаванні патрабаванняў сапраўднага стандарту да зместу адукацыйнай праграмы магістратуры.

7.4.3. Пры распрацоўцы вучэбнага плана ўстановы вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці рэкамендуецца прадугледжваць дысцыпліны па выбары магістранта ў аб'ёме да 50% ад колькасці вучэбных гадзін, якія адводзяцца на кампанент установы вышэйшай адукацыі.

7.4.4. Навучанне замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, замежных грамадзян і асоб без грамадзянства беларускай нацыянальнасці, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі замежных дзяржаў, а таксама замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, якім прадастаўлены статус бежанца ў Рэспубліцы Беларусь (далей – замежныя грамадзяне), якія атрымалі вышэйшую адукацыю першай ступені на тэрыторыі замежных дзяржаў, можа ажыццяўляцца па індывідуальных вучэбных планах з тэрмінам атрымання вышэйшай адукацыі да двух гадоў.

7.4.5. Неабходнасць складання індывідуальных вучэбных планаў для грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія атрымалі вышэйшую адукацыю першай ступені на тэрыторыі замежных дзяржаў, і замежных грамадзян, якія атрымалі вышэйшую адукацыю першай ступені ў Рэспубліцы Беларусь, вызначаецца ўстановай вышэйшай адукацыі.

7.4.6. Кіраўнік навукова-даследчай работы магістранта і тэма магістарскай дысертацыі зацвярджаюцца кіраўніком установы вышэйшай адукацыі.

**7.5. Патрабаванні да распрацоўкі індывідуальнага плана работы магістранта**

7.5.1. Індывідуальны план работы магістранта распрацоўваецца кіраўніком навукова-даследчай работы магістранта сумесна з магістрантам, абмяркоўваецца на пасяджэнні профільнай (выпускаючай) кафедры і зацвярджаецца кіраўніком установы вышэйшай адукацыі (намеснікам кіраўніка ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай рабоце).

7.5.2. Індывідуальны план работы магістранта распрацоўваецца на падставе вучэбнага плана ўстановы вышэйшай адукацыі па адпаведнай спецыяльнасці вышэйшай адукацыі другой ступені, устанаўлівае пералік і паслядоўнасць вывучаемых вучэбных дысцыплін, аб'ём вучэбнай нагрузкі, уключае праграму падрыхтоўкі магістарскай дысертацыі, праходжання практыкі, ажыццяўлення навукова-даследчай работы, формы і тэрміны справаздачнасці.

**7.6. Патрабаванні да абавязковага мінімуму зместу вучэбных праграм і кампетэнцый па вучэбных дысцыплінах**

7.6.1. Пры засваенні адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі другой ступені, якая фарміруе веды, уменні і навыкі навукова-педагагічнай і навукова-даследчай работы і забяспечвае атрыманне ступені магістра, змест агульнаадукацыйных дысцыплін і патрабаванні да кампетэнцый па гэтых дысцыплінах устанаўліваюцца праграмамі-мінімумамі кандыдацкіх экзаменаў па агульнаадукацыйных дысцыплінах і праграмамі-мінімумамі кандыдацкіх залікаў (дыферэнцаваных залікаў) па агульнаадукацыйных дысцыплінах, якія зацвярджаюцца Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

7.6.2. Пры засваенні адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі другой ступені, якая фарміруе веды, уменні і навыкі навукова-педагагічнай і навукова-даследчай работы і забяспечвае атрыманне ступені магістра, змест вучэбнай дысцыпліны «Педагогіка і псіхалогія вышэйшай школы» і патрабаванні да кампетэнцый па гэтай дысцыпліне ўстанаўліваюцца тыпавой вучэбнай праграмай, якая зацвярджаецца Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

7.6.3. Дысцыпліна дзяржаўнага кампанента цыкла дысцыплін спецыяльнай падрыхтоўкі

**Фундаментальныя праблемы тэорыі і гісторыі культуры**

Змест і марфалогія культуры, тыпалогія культуры (гістарычныя тыпы культуры, тыпалагічная мадэль культуры К. Ясперса, этнатэрытарыяльныя тыпы культуры і г.д.), фенаменалогія культуры, асноўныя канцэпцыі культуры (канцэпцыі цыклічнага развіцця культуры, псіхааналітычных канцэпцый культуры, гульнявыя і смехавая канцэпцыі культуры), дынаміка культуры, асноўныя канцэпцыі дынамікі культуры (тэорыя эвалюцыйнага развіцця культуры, дыфузіянізм, культурная антрапалогія, этнапсіхалагічны кірунак, функцыяналізм, культурны рэлятывізм, сінергетычная мадэль развіцця культуры, постмадэрнізм), футуралагічнае прагназаванне, міжкультурная камунікацыя.

Магістрант павінен ведаць:

– ключавыя метадалагічныя пазіцыі, прынцыпы і метады культуралогіі, якія забяспечваюць разуменне культуры як цэласнай інтэгратыўнай сістэмы ў непарыўным адзінстве ўніверсальнага і ўнікальнага;

– марфалогію культуры;

– асноўныя заканамернасці культурна-гістарычнага развіцця чалавека;

– параўнальны аналіз менталітэту народа ў розныя гістарычныя эпохі, тэндэнцый, базавых сімвалаў сусветнай і нацыянальнай культуры;

– праблемы крос-культурных камунікацый у кантэксце глабалізацыйных працэсаў;

– прагностыку культуры, педагагічныя, сацыяльныя, лінгвістычныя, арганізацыйныя і іншыя прыкладныя магчымасці культуралогіі.

Магістрант павінен умець:

– крытычна ўспрымаць разнастайныя з'явы культуры ў іх суаднесенасці з іншымі сферамі сацыяльнай жыццядзейнасці;

– прагназаваць, планаваць і ажыццяўляць дзейнасць у галіне культуры;

– адаптавацца ва ўмовах мультыкультурнай сітуацыі;

– асэнсаваць значэнне культуры як індыкатара стану грамадства;

– ацэньваць стан, тэндэнцыі і перспектывы развіцця сучаснай культуры;

– назапашваць тэарэтычны і эмпірычны матэрыял для выяўлення сутнасці і зместу культурных працэсаў;

– выкарыстоўваць метады культуралагічных даследаванняў;

– планаваць і ажыццяўляць навуковую дзейнасць у галіне культуры;

– фармуліраваць навуковую гіпотэзу як галоўны метадалагічны інструмент;

– апрацоўваць, аналізаваць і абагульняць навуковую інфармацыю.

7.6.4. Змест дысцыплін кампанента ўстановы вышэйшай адукацыі і патрабаванні да кампетэнцый па гэтых дысцыплінах устанаўліваюцца вучэбнымі праграмамі ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбных дысцыплінах.

7.6.5. Змест дысцыплін па выбары магістранта і патрабаванні да кампетэнцый па гэтых дысцыплінах устанаўліваюцца вучэбнымі праграмамі ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбных дысцыплінах у адпаведнасці з індывідуальным планам работы магістранта.

7.6.6. Вучэбныя праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбных дысцыплінах павінны адлюстроўваць дасягненні існуючых ва ўстанове вышэйшай адукацыі навукова-педагагічных школ па канкрэтных раздзелах адпаведных навук.

**7.7. Патрабаванні да зместу навукова-даследчай работы магістранта**

Патрабаванні да зместу навукова-даследчай работы распрацоўваюцца профільнай (выпускаючай) кафедрай.

**7.8. Патрабаванні да зместу і арганізацыі практыкі**

7.8.1. Адукацыйная праграма вышэйшай адукацыі другой ступені, якая фарміруе веды, уменні і навыкі навукова-педагагічнай і навукова-даследчай работы і забяспечвае атрыманне ступені магістра, прадугледжвае арганізацыю практыкі па спецыяльнасці ва ўстановах адукацыі або навуковых арганізацыях.

Практыка накіравана на замацаванне ведаў і ўменняў, атрыманых у працэсе тэарэтычнага навучання ў магістратуры, авалоданне навыкамі даследавання актуальных навуковых праблем, вырашэння сацыяльна-прафесійных задач, выкарыстоўвання інавацыйных тэхналогій.

## 8. Патрабаванні да арганізацыі адукацыйнага працэсу

**8.1. Патрабаванні да кадравага забеспячэння адукацыйнага працэсу**

Навукова-педагагічныя кадры для магістратуры павінны:

– мець вышэйшую адукацыю, якая адпавядае профілю выкладаемых дысцыплін і адпаведную навуковую кваліфікацыю (вучоную ступень і (або) вучонае званне);

– займацца навуковай і (або) навукова-метадычнай дзейнасцю;

– не менш аднаго раза ў 5 гадоў праходзіць павышэнне кваліфікацыі;

– валодаць сучаснымі адукацыйнымі, у тым ліку інфармацыйнымі тэхналогіямі, неабходнымі для арганізацыі адукацыйнага і навукова-даследчага працэсаў на патрэбным узроўні;

– валодаць асобаснымі якасцямі і кампетэнцыямі, якія дазваляюць эфектыўна арганізоўваць вучэбную і выхаваўчую работу з магістрантамі.

**8.2. Патрабаванні да матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння адукацыйнага працэсу**

Установа вышэйшай адукацыі павінна мець:

– матэрыяльна-тэхнічную базу, неабходную для арганізацыі адукацыйнага і навукова-даследчага працэсаў, самастойнай працы і развіцця асобы магістранта;

– сродкі навучання, неабходныя для рэалізацыі адукацыйнай праграмы магістратуры (прыборы, абсталяванне, інструменты, вучэбна-наглядныя дапаможнікі, камп'ютары, камп'ютарныя сеткі, аўдыявізуальныя сродкі і іншыя матэрыяльныя аб'екты).

**8.3. Патрабаванні да навукова-метадычнага забеспячэння адукацыйнага працэсу**

Навукова-метадычнае забеспячэнне адукацыйнага працэсу павінна адпавядаць наступным патрабаванням:

– дысцыпліны вучэбнага плана павінны быць аснашчаны сучаснай вучэбнай, навуковай, іншай літаратурай, вучэбнымі праграмамі, вучэбна-метадычнай дакументацыяй, вучэбна-метадычнымі, інфармацыйна-аналітычнымі матэрыяламі;

– павінен быць забяспечаны доступ для кожнага магістранта да бібліятэчных фондаў, электронных сродкаў навучання, электронных інфармацыйных рэсурсаў (лакальнага доступу, аддаленага доступу) па ўсіх вучэбных дысцыплінах.

Навукова-метадычнае забеспячэнне павінна быць арыентавана на распрацоўку і ўкараненне ў адукацыйны працэс інавацыйных адукацыйных тэхналогій, адэкватных кампетэнтнаснаму падыходу (варыятыўных мадэляў кіруемай самастойнай работы магістрантаў, вучэбна-метадычных комплексаў (у тым ліку электронных), модульных і рэйтынгавых сістэм навучання, тэставых і іншых сістэм ацэньвання ўзроўню кампетэнцый магістрантаў і да т.п.).

**8.4. Патрабаванні да арганізацыі самастойнай работы**

Патрабаванні да арганізацыі самастойнай работы ўстанаўліваюцца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

**8.5. Патрабаванні да арганізацыі ідэалагічнай і выхаваўчай работы**

Патрабаванні да арганізацыі ідэалагічнай і выхаваўчай работы ўстанаўліваюцца ў адпаведнасці з рэкамендацыямі па арганізацыі ідэалагічнай і выхаваўчай працы ва ўстановах вышэйшай адукацыі і праграмна-плануемай дакументацыяй выхавання.

**8.6. Агульныя патрабаванні да кантролю якасці адукацыі і сродкаў дыягностыкі кампетэнцый**

8.6.1. Кантроль якасці адукацыі ажыццяўляецца ў форме бягучай і выніковай атэстацыі магістрантаў.

8.6.2. Дыягнастычны інструментарый ацэнкі ўзроўню сфарміраванасці кампетэнцый устанаўліваецца профільнай (выпускаючай) кафедрай.

**9. Патрабаванні да выніковай атэстацыі**

**9.1. Агульныя патрабаванні**

Выніковая атэстацыя пры завяршэнні засваення зместу адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі другой ступені, якая фарміруе веды, уменні і навыкі навукова-педагагічнай і навукова-даследчай работы і забяспечвае атрыманне ступені магістра, дазваляе вызначыць тэарэтычную і практычную гатоўнасць выпускніка магістратуры да навукова-даследчай, вучэбна-педагагічнай, арганізацыйна-кіраўніцкай, інавацыйна-метадычнай дзейнасці і засваення адукацыйнай праграмы аспірантуры (ад'юнктуры).

**9.2. Патрабаванні да магістарскай дысертацыі**

9.2.1. Патрабаванні да структуры, зместу, аб'ёму і парадку абароны магістарскай дысертацыі вызначаюцца ўстановай вышэйшай адукацыі на падставе сапраўднага стандарту і Правіл правядзення атэстацыі студэнтаў, курсантаў, слухачоў пры засваенні зместу адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі.

9.2.2. Пры падрыхтоўцы магістарскай дысертацыі магістрант павінен прадэманстраваць, абапіраючыся на атрыманыя веды і сфарміраваныя акадэмічныя, сацыяльна-асобасныя і прафесійныя кампетэнцыі, уменне вырашаць на сучасным узроўні задачы прафесійнай дзейнасці, здольнасць інтэграваць навуковыя веды, навукова аргументаваць свой пункт гледжання.

9.2.3. Магістарская дысертацыя пры завяршэнні засваення зместу адукацыйнай праграмы вышэйшай адукацыі другой ступені, якая фарміруе веды, уменні і навыкі навукова-педагагічнай і навукова-даследчай работы і забяспечвае атрыманне ступені магістра, павінна быць накіравана на вырашэнне тэарэтычнай або эксперыментальнай задачы ў галіне культуралогіі.

Магістарская дысертацыя павінна змяшчаць рэфератыўную частку і навукова-даследчую частку, якая адлюстроўвае прафесійныя кампетэнцыі выпускніка магістратуры ў адпаведнасці са спецыяльнасцю падрыхтоўкі. Навукова-даследчая частка павінна складаць не менш за 50% аб'ёму дысертацыі.

**Дадатак**
(інфармацыйны)

## Бібліяграфія

[1] Кодекс Республики Беларусь об образовании, 13 янв. 2011 г., № 243-3 // Нац. реестр правовых акторв Респ. Беларусь. – 2011. – №13. – 2/1795.

[2] Государственная программа развития высшего образования на 2011–2015 гг. : постановление Совета Министров Респ. Беларусь, 1 июн. 2011 г., №893 // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. – 2011. – № 79. – 5/34104.

[3] Общегосударственный классификатор Республики Беларусь ОКРБ 011-2009. *Специальности и квалификации:* ОКРБ 011-2009. – Введ. 01.07.09. – Минск : М-во образования Респ. Беларусь : РИВШ, 2009. – 418 с.